ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
5 сакавіка 2016 г. № 185

# Аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485

У адпаведнасці з падпунктам 4.2 пункта 4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў» Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

Палажэнне аб парадку выдачы дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў, прыпынення, спынення яго дзеяння;

Палажэнне аб парадку ўліку выяўленых археалагічных аб’ектаў і (або) археалагічных артэфактаў;

Палажэнне аб абласных (Мінскай гарадской) камісіях па археалагічных аб’ектах і археалагічных артэфактах.

2. Дапоўніць адзіны пералік адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі ў дачыненні да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156 «Об утверждении единого перечня административных процедур, осуществляемых государственными органами и иными организациями в отношении юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, внесении дополнения в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 14 февраля 2009 г. № 193 и признании утратившими силу некоторых постановлений Совета Министров Республики Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2012 г., № 35, 5/35330; Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 16.08.2013, 5/37674; 15.10.2014, 5/39559), пунктамі 12.14 и 12.15 наступнага зместу:

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| «12.14. Выдача разрешения на право проведения археологических исследований | Национальная академия наук Беларуси | заявление по установленной форме<br><br>копия диплома о высшем образовании по специальности «Археология», «История (Археология)» физического лица, на чье имя представляется заявление о выдаче разрешения<br><br>документы, подтверждающие практику участия физического лица в археологических исследованиях на протяжении не менее двух лет в совокупности независимо от сроков перерыва<br><br>два заключения археологов, имеющих ученую степень Республики Беларусь, о владении физическим лицом научно-практическими знаниями для проведения археологических исследований и подготовки научного отчета о проведенных археологических полевых работах | 15 рабочих дней | до конца календарного года, в котором получено разрешение; при прекращении трудовых договоров (контрактов) или гражданско-правовых договоров в течение календарного года – до срока их прекращения | бесплатно |
| 12.15. Принятие решения об отнесении материального объекта к археологическим артефактам и включении его в реестр археологических артефактов | областная (Минская городская) комиссия по археологическим объектам и археологическим артефактам | заявление<br><br>материальный объект<br><br>две фотографии размером 10 x 15 см наиболее характерной проекции материального объекта | 30 рабочих дней | бессрочно | бесплатно». |

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 18 сакавіка 2016 г.

**Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь** **А.Кабякоў**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
05.03.2016 № 185

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку выдачы дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў, прыпынення, спынення яго дзеяння**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак выдачы дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў, прыпынення, спынення яго дзейнасці.

2. У дадзеным Палажэнні прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны:

археалагічныя даследаванні – комплекс навуковых мерапрыемстваў (разведкі, раскопкі, нагляд) па вывучэнні археалагічных аб’ектаў, помнікаў археалогіі і археалагічных артэфактаў;

археалагічная спадчына – сукупнасць археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў, у тым ліку помнікаў археалогіі;

навуковая справаздача аб выкананых археалагічных палявых работах (далей – навуковая справаздача) – асноўны дакумент, які змяшчае вынікі археалагічных даследаванняў, праведзеных на падставе выдадзенага дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў (далей – дазвол).

3. Дазвол выдаецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі (далей – НАН Беларусі).

4. Дадзенае Палажэнне з’яўляецца абавязковым для ўсіх юрыдычных і фізічных асоб, якія праводзяць археалагічныя даследаванні ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## ГЛАВА 2
## ПАРАДАК ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ І ЯГО ФОРМЫ

5. Дазвол выдаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах па заяве навуковых арганізацый або музеяў, у якіх працуюць на ўмовах працоўных дагавораў (кантрактаў) або ажыццяўляюць дзейнасць на падставе грамадзянска-прававых дагавораў фізічныя асобы (далей – фізічныя асобы, якія працуюць на ўмовах дагавораў), што адпавядаюць устаноўленым Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 17.12.2015, 1/16140) крытэрыям.

6. Для атрымання дазволу навуковыя арганізацыі і музеі (далей – зацікаўленыя асобы) звяртаюцца ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі (далей – НАН Беларусі) з заявай аб выдачы дазволу, якая складаецца па форме згодна з дадаткам 1 (далей – заява).

7. Да заявы прыкладаюцца дакументы, вызначаныя ў пункце 12.14 адзінага пераліку адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі ў дачыненні да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156 «Об утверждении единого перечня административных процедур, осуществляемых государственными органами и иными организациями в отношении юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, внесении дополнения в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 14 февраля 2009 г. № 193 и признании утратившими силу некоторых постановлений Совета Министров Республики Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2012 г., № 35, 5/35330).

8. У залежнасці ад характару даследаванняў дазвол мае чатыры формы згодна з дадаткамі 2 і 3:

форма № 1 – дазвол на выкананне археалагічных раскопак помнікаў і аб’ектаў археалогіі, археалагічных разведак і пошуку ў канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках;

форма № 2 – дазвол на выкананне археалагічных разведак і пошуку ў канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках, абмежаваных раскопак канкрэтных паселішчаў і грунтавых могільнікаў (участкі да 24 кв. метраў);

форма № 3 – дазвол на выкананне разведак і пошуку без земляных работ у канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках;

форма № 4 – дазвол на выкананне выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў (візуальнае абследаванне тэрыторыі новабудоўлі, пошук, нагляд, раскопкі) помнікаў і археалагічных аб’ектаў, якія знаходзяцца ў аварыйным стане ці ў зоне земляных і будаўнічых работ.

9. У адпаведнасці з дазволам, выдадзеным па формах № 1, 2, 4 згодна з дадаткамі 2 і 3 да дадзенага Палажэння, выкарыстоўваюцца металашукальнікі, геарадары і іншыя тэхнічныя сродкі і інструменты для абследавання паверхні зямлі і (або) дна прыродных і штучных вадаёмаў.

10. Падрыхтоўка дазволу для зацікаўленых асоб ажыццяўляецца на працягу 15 рабочых дзён з дня падачы заявы пры ўмове выканання патрабаванняў, вызначаных дадзеным Палажэннем.

Пры паступленні заявы зацікаўленых асоб НАН Беларусі на працягу трох рабочых дзён накіроўвае іх на разгляд у дзяржаўную навуковую ўстанову «Інстытут гісторыі НАН Беларусі» (далей – Інстытут гісторыі НАН Беларусі).

Па выніках разгляду заяў Інстытут гісторыі НАН Беларусі на працягу дзесяці рабочых дзён рыхтуе праект дазволу або праект аб адмове зацікаўленай асобе ў выдачы дазволу і накіроўвае ў НАН Беларусі.

11. Выдача дазволу фіксуецца ў кнізе рэгістрацыі дазволаў, форма якой зацвярджаецца НАН Беларусі.

12. Рашэнне НАН Беларусі аб адмове ў выдачы дазволу афармляецца ў пісьмовай форме з указаннем прычын адмовы і накіроўваецца зацікаўленай асобе.

13. Падставамі для адмовы ў выдачы дазволу з’яўляюцца:

13.1. наяўнасць у прадстаўленай зацікаўленымі асобамі заяве і прыкладзеных да яе дакументах несапраўдных звестак або неадпаведнасць іх патрабаванням заканадаўства аб адміністрацыйных працэдурах;

13.2. адсутнасць прафесійнай падрыхтоўкі ў галіне археалогіі і навукова-практычных ведаў, неабходных для правядзення археалагічных даследаванняў, і падрыхтоўкі належнай якасці навуковай справаздачы, а таксама адсутнасць практыкі ўдзелу ў археалагічных даследаваннях на працягу не менш чым два гады ў сукупнасці незалежна ад тэрмінаў перапынку;

13.3. існуючы дазвол на даследаванне ўказанага ў заяве археалагічнага аб’екта (помніка археалогіі) на імя іншай фізічнай асобы;

13.4. перавышэнне аб’ёмаў работ, якія былі прадугледжаны папярэднім дазволам, і (або) правядзенне работ на археалагічных аб’ектах (помніках археалогіі) ці ў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках, якія не былі ўказаны ў дазволе;

13.5. непрадстаўленне ў Інстытут гісторыі НАН Беларусі навуковай справаздачы па папярэднім дазволе або неналежная якасць навуковай справаздачы, выяўленая ў час яе прыняцця;

13.6. неажыццяўленне мерапрыемстваў па перадачы ў калекцыйны фонд дзяржаўнай навуковай арганізацыі або музейны фонд дзяржаўнага музея выяўленых археалагічных артэфактаў;

13.7. адсутнасць у прадстаўленай навуковай справаздачы па папярэднім дазволе дакумента аб перадачы археалагічных матэрыялаў на пастаяннае (часовае) захаванне ў дзяржаўную ўласнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

14. Зацікаўленая асоба мае права паўторна падаць заяву пасля ліквідацыі недахопаў, указаных у рашэнні НАН Беларусі аб адмове ў выдачы дазволу.

15. Дакументы, якія прадстаўлены зацікаўленай асобай на атрыманне дазволу, захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі на працягу тэрміну, прадугледжанага заканадаўствам.

16. Навуковыя справаздачы захоўваюцца ў Цэнтральным навуковым архіве НАН Беларусі (фондзе археалагічнай навуковай дакументацыі) пастаянна.

17. Зацікаўленыя асобы, якія атрымалі дазвол на імя фізічнай асобы, нясуць адказнасць за якасць выканання археалагічных даследаванняў, своечасовае прадстаўленне, паўнату і якасць навуковай справаздачы, а таксама захаванне выяўленых археалагічных артэфактаў і перадачу іх у дзяржаўную ўласнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

18. Зацікаўленыя асобы, якія атрымалі дазвол на імя фізічнай асобы, перад пачаткам археалагічных работ у пісьмовай форме інфармуюць органы мясцовай выканаўчай улады аб месцы і тэрмінах правядзення археалагічных даследаванняў з прыкладаннем копіі дазволу.

19. Дазвол выдаецца бясплатна.

## ГЛАВА 3
## ТЭРМІН ДЗЕЯННЯ ДАЗВОЛУ, ПАДСТАВЫ ДЛЯ ЯГО ПРЫПЫНЕННЯ І СПЫНЕННЯ

20. Тэрмін дзеяння дазволу сапраўдны з дня яго выдачы да канца каляндарнага года, у якім атрыманы дазвол.

У выпадку заканчэння дзеяння на працягу каляндарнага года працоўных адносін (працоўных дагавораў (кантрактаў), грамадзянска-прававых дагавораў) паміж навуковай арганізацыяй або музеем з фізічнай асобай, на чыё імя выдадзены дазвол, дазвол выдаецца да тэрміну дзеяння працоўных адносін.

21. Падставамі для прыпынення дзеяння дазволу з’яўляюцца:

21.1. выкарыстанне фізічнай асобай, на чыё імя выдадзены дазвол, метадаў і методык, якія не адпавядаюць сучасным патрабаванням выканання палявых археалагічных работ і вядуць да пашкоджання археалагічнага аб’екта (помніка археалогіі), культурнага пласта (слоя), страты археалагічных артэфактаў і навуковай інфармацыі;

21.2. непрадстаўленне ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган паведамлення аб месцы і тэрмінах правядзення археалагічных даследаванняў з прыкладаннем копіі дазволу;

21.3. непаведамленне ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган аб выяўленых археалагічных аб’ектах і археалагічных артэфактах.

22. Падставамі для спынення дзеяння дазволу з’яўляюцца:

22.1. паўторнае выкарыстанне фізічнай асобай, на чыё імя выдадзены дазвол, метадаў і методык, якія не адпавядаюць сучасным патрабаванням да выканання палявых археалагічных работ і вядуць да пашкоджання археалагічнага аб’екта (помніка археалогіі), культурнага пласта (слоя), страты археалагічных артэфактаў і навуковай інфармацыі;

22.2. перавышэнне фізічнай асобай, на чыё імя выдадзены дазвол, аб’ёмаў і змяненне характару археалагічных палявых работ, абумоўленых дазволам, а таксама неадпаведнасць заяўленай тэрыторыі даследаванняў;

22.3. непаведамленне ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган аб выяўленых на падставе раней выдадзеных дазволаў археалагічных аб’ектах і археалагічных артэфактах і неперадача мясцоваму выканаўчаму і распарадчаму органу выяўленых археалагічных артэфактаў (за выключэннем археалагічных артэфактаў, выяўленых фізічнымі асобамі, якія працуюць на ўмовах дагавораў у дзяржаўных навуковых арганізацыях і дзяржаўных музеях).

23. Аб прыпыненні або спыненні дзеяння дазволу НАН Беларусі ў пісьмовай форме інфармуе зацікаўленыя асобы, якія атрымалі дазвол, а таксама мясцовыя выканаўчыя

і распарадчыя органы, на тэрыторыі якіх планаваліся або вяліся археалагічныя даследаванні.

24. Нявыкарыстаны дазвол пасля заканчэння тэрміну яго дзеяння вяртаецца ў НАН Беларусі з тлумачальным лістом зацікаўленай асобы, якая яго атрымала, аб прычынах невыканання запланаваных работ.

25. Зацікаўленыя асобы пры правядзенні археалагічных даследаванняў маюць права прыцягваць іншых фізічных асоб (удзельнікі археалагічных даследаванняў) на падставе грамадзянска-прававых дагавораў або дагавораў аб арганізацыі практыкі студэнтаў для выканання падрыхтоўчых і дапаможных работ пад кіраўніцтвам фізічнай асобы, на чыё імя выдадзены дазвол.

26. Выкананне работ на археалагічных аб'ектах і помніках археалогіі і (або) пошук археалагічных артэфактаў, выкананне іншых відаў работ без дазволу забараняюцца.

Дадатак 1
да Палажэння аб парадку
выдачы дазволу на права
правядзення археалагічных
даследаванняў, прыпынення,
спынення яго дзеяння

Форма

**ЗАЯВА**
**аб выдачы дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў***

______________________________________________________________
(поўная назва навуковай арганізацыі, музея)

хадайнічае аб выдачы дазволу па форме № __ на права правядзення археалагічных даследаванняў ____________________________________________________
(назва археалагічных аб'ектаў (помнікаў археалогіі), на якіх плануюцца археалагічныя
_______________________________________________________________________
даследаванні, і іх лакалізацыя згодна з сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным размяшчэннем)
на імя __________________________________________________________________
(прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці) фізічнай асобы,
_______________________________________________________________________
дакумент, які сведчыць асобу, яго нумар, кім і калі выдадзены, месца жыхарства
_______________________________________________________________________,
(рэгістрацыі) фізічнай асобы, паштовы адрас, тэлефон, электронны адрас)
які ____________________________________________________________________
(працуе на ўмовах працоўнага дагавора (кантракта) або ажыццяўляе дзейнасць
_______________________________________________________________________
на падставе грамадзянска-прававога дагавора, дата дагавора і тэрмін яго дзеяння)
і мае вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці ______________________________.
(«Археалогія» і (або) «Гісторыя (Археалогія)»)

Кіраўнік (або ўпаўнаважаная ім асоба) _______________ ______________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
М.П.

______________________________
(пасада)

Да заявы на атрыманне дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў (пры першай падачы дакументаў) прыкладаюцца:

копія дыплома аб вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Археалогія», «Гісторыя (Археалогія)»;

дакументальнае пацвярджэнне практыкі ўдзелу ў археалагічных даследаваннях на працягу не менш чым два гады ў сукупнасці незалежна ад тэрмінаў перапынку;

два заключэнні археолагаў, якія маюць вучоную ступень Рэспублікі Беларусь, аб валоданні фізічнай асобай навукова-практычнымі ведамі, неабходнымі для правядзення археалагічных даследаванняў.

______________________

* Падаецца на афіцыйным бланку навуковай арганізацыі або музея.

Дадатак 2
да Палажэння аб парадку
выдачы дазволу на права
правядзення археалагічных
даследаванняў, прыпынення,
спынення яго дзеяння

Форма ___________
(№ 1, 2 або 3)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

**ДАЗВОЛ**
**НА ПРАВА ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**
**№ ________**

Дазвол сапраўдны да 31 снежня 20__ г., а пры спыненні працоўных (грамадзянска-прававых) адносін раней 31 снежня 20__г. – да спынення такіх адносін

Дазвол выдадзены ___________________________________________________
(прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці),
_____________________________________________________________________,
дакумент, які сведчыць асобу, яго нумар, кім і калі выдадзены)
які ___________________________________________________________________
(працуе на ўмовах працоўнага дагавора (кантракта) або ажыццяўляе дзейнасць
_____________________________________________________________________
на падставе грамадзянска-прававога дагавора, дата дагавора і тэрмін яго дзеяння)
у ____________________________________________________________________:
(поўная назва навуковай арганізацыі або музея)

на выкананне археалагічных раскопак канкрэтных помнікаў і аб’ектаў археалогіі ___________________________________________________________;
(назва археалагічных аб’ектаў (помнікаў археалогіі), на якіх плануюцца
_____________________________________________________________________
археалагічныя даследаванні, і іх лакалізацыя згодна з сучасным
_____________________________________________________________________
адміністрацыйна-тэрытарыяльным размяшчэннем)

на выкананне археалагічных разведак і пошуку ў канкрэтных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках _________________________________________;
(назва адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі)

на выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў для абследавання паверхні зямлі і (або) дна прыродных і штучных вадаёмаў _____________________________________________________.
(дазволена, забаронена)

Усім органам улады, дзяржаўным установам, грамадскім арганізацыям і прыватным асобам належыць садзейнічаць _____________________________________
(прозвішча, асабістае імя, імя
_____________________________________________________________________
па бацьку (пры яго наяўнасці) фізічнай асобы)
у выкананні ўскладзеных на яго (яе) абавязкаў.

Дазвол сапраўдны толькі пры аднačасовым прад'яўленні пашпарта ці іншага дакумента, які сведчыць асобу.

Кіраўнік (або ўпаўнаважаная ім асоба) _______________ _____________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
М.П.

______________________________
(пасада)

Дадатак 3
да Палажэння аб парадку
выдачы дазволу на права
правядзення археалагічных
даследаванняў, прыпынення,
спынення яго дзеяння

Форма № 4

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

**ДАЗВОЛ**
**НА ПРАВА ПРАВЯДЗЕННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**
**№ ________**

Дазвол сапраўдны да 31 снежня 20__ г., а пры спыненні працоўных (грамадзянска-прававых) адносін раней 31 снежня 20__г. – да спынення такіх адносін

Дазвол выдадзены ______________________________________________________
(прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці),
_____________________________________________________________________,
дакумент, які сведчыць асобу, яго нумар, кім і калі выдадзены)
які __________________________________________________________________
(працуе на ўмовах працоўнага дагавора (кантракта) або ажыццяўляе дзейнасць
_____________________________________________________________________
на падставе грамадзянска-прававога дагавора, дата дагавора і тэрмін яго дзеяння)
у ___________________________________________________________________:
(поўная назва навуковай арганізацыі або музея)

на выкананне выратавальных (ахоўных) археалагічных даследаванняў (абследаванне тэрыторыі новабудоўлі, раскопкі, нагляд) археалагічных аб'ектаў і помнікаў археалогіі, якія знаходзяцца ў аварыйным стане ці ў зоне земляных і будаўнічых работ _____________________________________________________
(назва будаўнічага аб'екта і адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі,
_____________________________________________________________________;
поўная назва заказчыка работ)

на выкарыстанне металашукальнікаў, геарадараў і іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў для абследавання паверхні зямлі і (або) дна прыродных і штучных вадаёмаў ___________________________________________________________.
(дазволена, забаронена)

Усім органам улады, дзяржаўным установам, грамадскім арганізацыям і прыватным асобам належыць садзейнічаць ____________________________________
(прозвішча, асабістае імя, імя
_____________________________________________________________________
па бацьку (пры яго наяўнасці) фізічнай асобы)
у выкананні ўскладзеных на яго (яе) абавязкаў.

Дазвол сапраўдны толькі пры адначасовым прад'яўленні пашпарта ці іншага дакумента, які сведчыць асобу.

Кіраўнік (або ўпаўнаважаная ім асоба) ________________ ________________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
М.П.

__________________________________
(пасада)

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
05.03.2016 № 185

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку ўліку выяўленых археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў**

1. Дадзеным Палажэннем, распрацаваным у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 17.12.2015, 1/16140), вызначаюцца асноўныя патрабаванні да парадку ўліку археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў, якія выяўлены ў час навуковых археалагічных палявых работ на падставе дазволу на права правядзення археалагічных даследаванняў, а таксама да фізічных і юрыдычных асоб, што выпадкова выявілі ў зямлі або на дне прыродных і штучных вадаёмаў матэрыяльны аб'ект, які можа мець прыкметы археалагічнага аб'екта або археалагічнага артэфакта.

2. Для мэт дадзенага Палажэння выкарыстоўваюцца тэрміны ў значэннях, вызначаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485.

3. Улік выяўленых археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў ажыццяўляецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі або ўпаўнаважанай ёю юрыдычнай асобай у мэтах дакладнай фіксацыі і ўліку выяўленых археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў на падставе папяровай і электроннай дакументацыі, прадстаўленай абласнымі (Мінскай гарадской) камісіямі па археалагічных аб'ектах і археалагічных артэфактах.

4. Улік археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў складаецца з іх рэгістрацыі і вядзення іх уліку ў папяровым і электронным выглядзе.

5. Рэгістрацыя археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў афармляецца ўліковай карткай у папяровым і электронным выглядзе, форма якой устанаўліваецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі або ўпаўнаважанай ёю юрыдычнай асобай.

6. Улік археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў ажыццяўляецца спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія маюць адпаведную кваліфікацыю, што дазваляе праводзіць ім прыём, фіксацыю, аналіз і рэдагаванне інфармацыі аб археалагічных аб'ектах і (або) археалагічных артэфактах, занясенне яе ў электронную базу даных.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
05.03.2016 № 185

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб абласных (Мінскай гарадской) камісіях па археалагічных аб’ектах і археалагічных артэфактах**

1. Дадзеным Палажэннем, распрацаваным у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485 «Аб удасканаленні аховы археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў» (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 17.12.2015, 1/16140), вызначаецца парадак стварэння і дзейнасці абласных (Мінскай гарадской) камісій па археалагічных аб’ектах і археалагічных артэфактах (далей – археалагічныя камісіі).

2. Археалагічная камісія ствараецца абласным выканаўчым (Мінскім гарадскім) камітэтам у мэтах прыняцця рашэння аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта і ўключэння яго ў рэестр археалагічных артэфактаў (далей – рэестр).

Археалагічная камісія фарміруецца ў складзе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і членаў камісіі.

3. У склад археалагічнай камісіі ўваходзяць прадстаўнікі аблвыканкамаў (Мінскага гарвыканкама), спецыялісты ў галіне археалогіі і гісторыі навуковых арганізацый, музеяў і ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Склад археалагічнай камісіі зацвярджаецца абласнымі выканаўчымі (Мінскім гарадскім) камітэтамі.

Члены археалагічных камісій ажыццяўляюць свае абавязкі на грамадскіх пачатках.

4. Археалагічная камісія з’яўляецца дарадчым і кансультатыўным органам, у сваёй дзейнасці кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дадзеным Палажэннем.

5. Сваю дзейнасць археалагічная камісія ажыццяўляе ва ўзаемадзеянні з дзяржаўнымі органамі, навуковымі арганізацыямі, музеямі і арганізацыямі культуры Рэспублікі Беларусь.

6. Асноўнымі задачамі археалагічнай камісіі з’яўляюцца:

разгляд заяў фізічных і юрыдычных асоб аб прыняцці рашэння аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта;

прыняцце рашэння аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта, які выпадкова выявіла ў зямлі або на дне прыродных і штучных вадаёмаў фізічная або юрыдычная асоба і які можа мець гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае культурнае значэнне, адпавядаць крытэрыям для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, вызначаным заканадаўствам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, і на момант яго выяўлення не мае ўласніка;

выдача заключэння аб уключэнні археалагічнага артэфакта ў рэестр.

7. У адпаведнасці з ускладзенымі задачамі археалагічная камісія:

7.1. разглядае інфармацыю мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб выяўленых матэрыяльных аб’ектах;

7.2. ажыццяўляе прыём заяў фізічных і юрыдычных асоб аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта;

7.3. праводзіць разгляд і аналіз матэрыяльнага аб’екта на прадмет аднясення яго да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта;

7.4. прымае рашэнні:

аб адмове ў прыняцці заявы;

аб аднясенні (неаднясенні) матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта;

аб аднясенні (неаднясенні) матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага артэфакта і ўключэнні яго ў рэестр;

7.5. выдае заключэнне аб уключэнні археалагічнага артэфакта ў рэестр.

8. Археалагічную камісію ўзначальвае старшыня.

9. Старшыня археалагічнай камісіі мае права афіцыйна запрашаць для ўдзелу ў яе рабоце на грамадскіх пачатках экспертаў (спецыялістаў у галіне нумізматыкі, сфрагістыкі, бутаністыкі, фалерыстыкі і іншых), прадстаўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых зацікаўленых у вырашэнні пытанняў, якія разглядаюцца на пасяджэннях археалагічнай камісіі.

10. Старшыня археалагічнай камісіі:

кіруе дзейнасцю і арганізуе работу археалагічнай камісіі;

фарміруе парадак дня, вызначае дату, месца і час правядзення пасяджэння археалагічнай камісіі, праводзіць пасяджэнні археалагічнай камісіі;

выконвае іншыя функцыі па арганізацыі дзейнасці археалагічнай камісіі.

У выпадку адсутнасці старшыні камісіі яго абавязкі выконвае намеснік старшыні камісіі.

11. Арганізацыйна-тэхнічная работа археалагічнай камісіі забяспечваецца сакратаром археалагічнай камісіі, які ажыццяўляе прыём заяў, вядзе падрыхтоўку да пасяджэнняў, рыхтуе запыты на прадастаўленне дакументаў і звестак, неабходных для прыняцця рашэння, афармляе заключэнні археалагічнай камісіі, вырашае іншыя арганізацыйныя пытанні дзейнасці археалагічнай камісіі.

12. Пасяджэнні археалагічнай камісіі праводзяцца па меры неабходнасці.

13. Члены археалагічнай камісіі і запрошаныя апавяшчаюцца сакратаром аб даце, месцы, часе і павестцы чарговага пасяджэння археалагічных камісій не пазней чым за два каляндарныя дні да дня яго правядзення.

Пасяджэнні археалагічнай камісіі лічацца правамоцнымі, калі на іх прысутнічала не менш за дзве трэці яе членаў.

14. Падставай для разгляду пытання аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта з’яўляецца паведамленне мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб выяўленых матэрыяльных аб’ектах, якое разглядаецца археалагічнай камісіяй не пазней чым за 30 рабочых дзён з дня яго паступлення. Мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, які накіраваў паведамленне, забяспечвае доступ да выяўленага матэрыяльнага аб’екта.

15. Падставай для разгляду пытання аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага артэфакта і ўключэнні археалагічнага артэфакта ў рэестр з’яўляюцца заява і іншыя дакументы ў адпаведнасці з пунктам 8.8 пераліку адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 г. № 200 «Об административных процедурах, осуществляемых государственными органами и иными организациями по заявлениям граждан» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2010 г., № 119, 1/11590), або пунктам 12.15 адзінага пераліку адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі ў дачыненні да юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 лютага 2012 г. № 156 «Об утверждении единого перечня административных процедур, осуществляемых государственными органами и иными организациями в отношении юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, внесении дополнения в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 14 февраля 2009 г. № 193 и признании утратившими силу некоторых постановлений Совета Министров Республики Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2012 г., № 35, 5/35330), якія падаюцца ў ходзе асабістага прыёму, праз пошту або нарачным (кур’ерам).

16. У заяве, названай у пункце 15 дадзенага Палажэння, неабходна ўказаць:

назву ўпаўнаважанага органа, у які падаецца заява;

назву адміністрацыйнай працэдуры;

месца, умовы і час выяўлення матэрыяльнага аб’екта і яго кароткае апісанне;

звесткі аб асобе, якая выявіла матэрыяльны аб’ект:

прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці), месца жыхарства (месца знаходжання), тэлефон, адрас электроннай пошты грамадзяніна;

назву, месца знаходжання, тэлефон, адрас электроннай пошты юрыдычнай асобы, найменне дзяржаўнага органа, іншай дзяржаўнай арганізацыі, якія ажыццявілі дзяржаўную рэгістрацыю, рэгістрацыйны нумар у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

подпіс грамадзяніна або подпіс кіраўніка юрыдычнай асобы ці асобы, упаўнаважанай ва ўстаноўленым парадку падпісваць заяву, заверааны пячаткай юрыдычнай асобы, або подпіс прадстаўніка зацікаўленай асобы.

17. Археалагічная камісія адмаўляе ў прыняцці заявы:

калі заявіцелем не прадстаўлена ўся неабходная інфармацыя згодна з пунктамі 15 і 16 дадзенага Палажэння;

у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Рашэнне аб адмове ў прыняцці заявы прымаецца не пазней чым за пяць рабочых дзён з дня падачы такой заявы.

18. Заява разглядаецца на пасяджэнні археалагічнай камісіі ў тэрмін не больш за 30 рабочых дзён з дня падачы заявы.

19. Зацікаўленая асоба мае права прысутнічаць на пасяджэннях археалагічных камісій.

20. Археалагічная камісія абавязана забяспечыць належныя ўмовы захавання матэрыяльнага аб’екта, перададзенага для прыняцця заключэння аб аднясенні яго да археалагічнага аб’екта або археалагічнага артэфакта. На час знаходжання матэрыяльнага аб’екта ў археалагічнай камісіі заявіцелю выдаецца даведка аб часовым захаванні.

21. Рашэнне аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага артэфакта і ўключэння яго ў рэестр прымаецца на пасяджэнні археалагічнай камісіі адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў (пры наяўнасці заключэння археолага дзяржаўнай навуковай арганізацыі і (або) дзяржаўнага музея Рэспублікі Беларусь).

22. Рашэнне археалагічнай камісіі па выніках разгляду заявы аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага артэфакта і ўключэнні археалагічнага артэфакта ў рэестр падпісваецца асобай, якая старшынствавала на пасяджэнні, і сакратаром археалагічнай камісіі.

23. Рашэнне аб неаднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта прымаецца ў выпадках, калі матэрыяльны аб’ект:

не з’яўляецца вынікам жыцця і дзейнасці чалавека;

узнік менш за 120 гадоў таму назад;

не мае гістарычнага, мастацкага, навуковага або іншага культурнага значэння.

24. Рашэнне аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага артэфакта і неўключэнні археалагічнага артэфакта ў рэестр прымаецца, калі:

археалагічны артэфакт паступіў ва ўладанне фізічных і юрыдычных асоб пасля 17 сакавіка 2016 г.;

заява пададзена пасля 31 снежня 2016 г.

Рашэнне аб аднясенні матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта і рашэнне аб уключэнні археалагічнага артэфакта ў рэестр не прымаецца, калі прадстаўленыя матэрыялы і (або) дакументы не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, у тым ліку з’яўляюцца падложнымі, падробленымі або несапраўднымі.

25. У выпадку прыняцця археалагічнай камісіяй рашэння аб аднясенні (неаднясенні) матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага аб’екта і (або) археалагічнага артэфакта выпіска з рашэння не пазней чым за тры дні з дня прыняцця рашэння накіроўваецца ў адпаведны мясцовы выканаўчы і распарадчы орган.

У выпадку прыняцця археалагічнай камісіяй рашэння аб аднясенні (неаднясенні) матэрыяльнага аб’екта да археалагічнага артэфакта і ўключэнні археалагічнага артэфакта

ў рэестр зацікаўленай асобе выдаецца выпіска з такога рашэння ў тэрмін не больш чым за пяць рабочых дзён з дня прыняцця такога рашэння.

Зацікаўленая асоба мае права абскардзіць рашэнне аб аднясенні (неаднясенні) матэрыяльнага аб'екта да археалагічнага артэфакта і ўключэнні (неўключэнні) археалагічнага артэфакта ў рэестр у адпаведнасці з заканадаўствам аб асновах адміністрацыйных працэдур.

26. У выпадку прыняцця археалагічнай камісіяй рашэння аб аднясенні матэрыяльнага аб'екта да археалагічнага артэфакта і ўключэнні яго ў рэестр рашэнне з інфармацыяй аб месцы, умовах і часе выяўлення матэрыяльнага аб'екта з геаграфічнай прывязкай да адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, вынікі фотафіксацыі накіроўваюцца ў папяровым і электронным выглядзе ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі або ўпаўнаважаную ёю юрыдычную асобу ў тэрмін, які не перавышае 14 рабочых дзён з дня прыняцця рашэння.

27. Археалагічная камісія накіроўвае паведамленне ў папяровым і электронным выглядзе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі або ўпаўнаважанай ёю юрыдычнай асобе аб усіх зменах месца захавання матэрыяльнага аб'екта, які прызнаны археалагічным артэфактам, згодна з інфармацыяй заявіцеля.

28. Арганізацыйнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці археалагічных камісій ажыццяўляецца адпаведнымі аблвыканкамамі (Мінскім гарвыканкамам).